**УДК 821.162.1-311.6:94(476.5)**

# МАСТАЦКАЯ РЭЦЭПЦЫЯ ГІСТОРЫІ XVI СТАГОДДЗЯ Ў ТРЫЛОГІІ ЯНА КАНТРЫМОВІЧА-АГІНСКАГА «W PROMIENIACH SŁAWY»: УЗЯЦЦЕ ПОЛАЦКА

***канд. філал. навук, дац. Г.А. ГЛАДКОВА***
***(Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0002-2275-2700***

*У артыкуле на матэрыяле гістарычнай аповесці Яна Кантрымовіча-Агінскага «W promieniach sławy» разглядаецца мастацкая рэцэпцыя ваенных падзей другой паловы XVI стагоддзя – паход караля Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя на Полацк і ўзяцце горада ў 1579 годзе як частка заключнага этапа Лівонскай вайны. Адзначана спецыфіка аўтарскай інтэрпрэтацыі гістарычнага матэрыяла, выяўлена гісторыяграфічная крыніца, якая была пакладзена ў аснову аповесці, улічаны ўплыў нацыянальнага стэрэатыпу, які праявіўся ў адборы пісьменнікам фактаў і асаблівасцях іх мастацкай трансляцыі. Неабходная ўвага нададзена кампазіцыйным прыёмам, якія дазволілі Я. Кантрымовічу-Агінскаму спалучыць у адзінстве два асобныя эпізоды тагачаснай гісторыі: спробу арганізаваць замах на жыццё польскага караля і кіраўніцтва С. Баторыем штурмам умацаванняў Полацка. Вылучаны асноўныя прыёмы стварэння мастацкіх вобразаў (ідэалізацыя, мастацкі паралелізм і інш.).*

***Ключавыя словы:*** *Рэч Паспалітая, Лівонская вайна, асада Полацка, рэцэпцыя, нацыянальны стэрэатып, мастацкі вобраз, жанр, стыль.*

**Уводзіны.** Мастацкая інтэрпрэтацыя гісторыі ва ўсе эпохі прываблівала пісьменнікаў. Гісторыя Полацка не стала выключэннем, пра горад і яго славутых дзеячаў пісалі М. Багдановіч, В. Ластоўскі, У. Караткевіч, А. Лойка і інш. [1]. Актуальным напрамкам сучаснага літаратуразнаўства бачыцца даследаванне беларускага (літвінскага) кантэксту ў мастацкіх творах суседніх літаратур, што дазволіць удакладніць спецыфіку нацыянальнай ідэнтычнасці праз погляд носьбітаў іншай культуры. Так, дастаткова багаты матэрыял па дадзенай праблеме можа быць актуалізаваны дзякуючы набыткам польскай літаратуры, у прыватнасці, гісторыя Літвінскага краю згадваецца ў творах А. Накваскі і Т. Ежа (З.Мілкоўскага), Ф. Асяндоўскага і Л. Патоцкага, В. Гамуліцкага, Я. Кантрымовіча-Агінскага і інш.

Мэта артыкула – на матэрыяле гістарычнай аповесці «Połock» з трылогіі Яна Кантрымовіча-Агінскага «W promieniach sławy» выявіць асаблівасці мастацкай інтэрпрэтацыі ваенных падзей XVI стагоддзя.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы: азнаёміцца з другім томам гістарычнай трылогіі Я. Кантрымовіча-Агінскага «W promieniach sławy» (аповесць «Połock»), а таксама гістарычнымі і літаратуразнаўчымі даследаваннямі па тэме; выявіць у мастацкім тэксце эпізоды, звязаныя з гісторыяй Полацкай зямлі; ахарактарызаваць вобразную сістэму твора; вызначыць спецыфіку аўтарскага асэнсавання ў аповесці гісторыі XVI стагоддзя.

**Асноўная частка.** Польскі пісьменнік Ян Кантрымовіч-Агінскі (1829–1913) адзначыўся ў літаратуры гістарычнай прозай, сярод якой вылучаецца трылогія «W promieniach sławy» (1909), якая складаецца з аповесцей «Gdańsk» («Гданьск»), «Połock» («Полацк»), «Pskow» («Пскоў»). У аснове сюжэта – эпізоды Лівонскай вайны з акцэнтам на дзейнасці караля Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя па вяртанні захопленага Масковіяй Полацка і пскоўскай ваеннай аперацыі. Як вядома, узяцце Полацка ў 1579 г. стала пераломным момантам Лівонскай вайны 1558 – 1583 гг. Прэцэдэнтам для намераў па вяртанні старажытнага горада пад уладу Рэчы Паспалітай стаў захоп Полацка маскоўскім войскам у 1563 г. Менавіта С. Баторый выказаў намер вярнуць страчаны горад, «*będący bramą do Inflant i Litwy*» («які быў брамай да Інфлянтаў і Літвы» – *тут і далей пераклад Г.Г.*), што давала адразу некалькі пераваг. Па-першае, такі манеўр дазваляў перанесці тэатр ванных падзей на землі маскоўскай дзяржавы, па-другое, вяртанне Полацка было своеасаблівым рэваншам за ваенныя няўдачы 1563 года: «*Połock przed kilkunastu laty dopiero przyłączony do Moskwy, odzyskać było obowiązkiem honoru*» («Полацк здабыць, які ўжо некалькі гадоў быў далучаны да Масквы, было справай гонару») [2, с. 50].

У аповесці падкрэсліваецца, што шляхта Рэчы Паспалітай ахвотна фінансавала ваенны паход Баторыя, нават жаўнер, які не меў шляхецтва (у аповесці – герой Ян Вонсік), прывёз велізарную колькасць грошай, заробленых гандлем. З адпаведным патрыятычным пафасам кароль ацаніў такі ўчынак: «*Szczęśliwa kraina, gdzie rodzą się tacy ludzie*» («Шчаслівая краіна, дзе родзяцца такія людзі») [2, с. 24].

Апісанню штурму Полацка папярэднічае эпізод, звязаны з асобай авантурыста, па трапным вызначэнні Л. Рублеўскай, «высакароднага аферыста» Грыгорыя Осціка [3, с. 51]. Аўтарская ацэнка гэтай гістарычнай асобы праявілася праз своеасаблівы лінгвакультурны тыпаж: гэта, напрыклад, партрэтная дэталь (чырвоныя валасы, якія вылучаюць героя сярод іншых і падмацоўваюць уяўленне пра яго як пра натуру хітрага, здольнага на падман чалавека), маўленне персанажа (лексіка зняважальнага характару), паводзіны героя, яго псіхалагічныя адметнасці (жорсткасць, сквапнасць да грошай). Прыспешнікамі Осціка сталі Сцерваедаў і Сукін, гаваркія імёны якіх – яшчэ адзін традыцыйны пісьменніцкі прыём для перадачы ўласных антыпатый аўтара. У тэксце твора агучаны незаконныя справы пана Осціка: выраб фальшывых грошай, падробка дакументаў і пячатак магнатаў Літвы. Фабрыкуючы «лісты літвінскай шляхты» да рускага цара з абацаннем падтрымкі і чаканнем матэрыяльных узнагарод,

а таксама плануючы замах на жыццё караля Рэчы Паспалітай рукамі злодзеяў, Осцік канчаткова згубіў павагу да сябе і прадвызначыў свой лёс.

У адступленні Кантрымовіч-Агінскі падсумаваў, што дадзены эпізод з гісторыі супрацьстаяння Рэчы Паспалітай і Масковіі дэманструе, што Іван IV ужываў любыя сродкі ў змаганні (подкуп, разбой і г.д.), Стэфан Баторый, наадварот, ахарактарызаваны аўтарам як чалавек «рыцарскай дабрачыннасці і шляхетнасці», што не супярэчыла агульнаму вектару польскай літаратуры ў асвятленні ваенных канфліктаў з маскоўскай дзяржавай (згадаем аналагічны характар вобраза паўночна-усходняга суседа Рэчы Паспалітай у «Запісках пра Маскоўскую вайну» Рэйнгальда Гейдэнштэйна ці ў «Паходзе на Маскву Кшыштафа Радзівіла, польнага гетмана ВКЛ у 1581 г.» Яна Каханоўскага). Натуральна, што аўтарская антыпатыя да прадстаўнікоў маскоўскай дзяржавы тлумачыцца замацаваным у свядомасці этнічных палякаў стэрэатыпам, які пачаў фарміравацца ў XVI стагоддзі, калі кантакты палякаў з Масковіяй былі пераважна ваеннымі, а значыць, насцярожанасць і прадузятасць у адносінах да чужынцаў была зразумелай.

Ускосна з тэкста аповесці вынікае параўнанне матываў барацьбы палякаў і маскавітаў: першыя не шкадуюць сваіх грошай на вайну з Іванам IV, другія бачаць толькі ўласную карысць і чакаюць грашовы набытак ад маскоўскай улады за службу. Адносна апошняй заўвагі аўтара ўдакладнім, што пытанне фінансавання вайны для Рэчы Паспалітай не было такім лёгкім, як адзначаў Р. Гейдэнштэйн. С. Баторый часткова ўзяў грошы ў пазыку, часткова даў свае, адначасова звярнуўся па дапамогу да немцаў і венграў. Літва адгукнулася на просьбу караля: калі колькасць літвінаў стала даходзіць да дзесяці тысяч чалавек, кароль, падбадзёраны іх стараннасцю, з вялікім натхненнем заняўся іншымі справамі [4, с. 38–39].

Аўтар паслядоўна пералічыў асноўных удзельнікаў паходу. Войска Рэчы Паспалітай складалася з кавалерыі літвінаў (Радзівілаў, Кішкаў, Хадкевічаў, Агіньскіх), польскіх узброеных сіл (Збароўскіх, Сіняўскіх, Фірпеяў і інш.), венгерскай артылерыі, запарожскіх казакаў, ваеннай дапамогі з Курляндыі і Сямігаліі. Як бачна, С. Баторый рабіў стаўку не толькі на «паспалітае рушанне», але і на вопыт наёмных ваяроў. Асаблівую ўвагу пісьменнік надаў казацкаму войску: у тэксце прадстаўлены аўтэнтычны матэрыял (казацкая песня XVI ст. «То не вітр буйный…»), перададзены асаблівасці ўкраінскай гаворкі, падкрэслена роля казакаў у ваеннай кампаніі караля Рэчы Паспалітай.

У тэксце аповесці адносна вобраза С. Баторыя ў наяўнасці мастацкае дапушчэнне: рэплікі караля пададзены па-польску, што не адпавядае гістарычнай рэальнасці, бо, як вядома, С. Баторый не разумеў польскай мовы і гаварыў на латыні [4, с. 38]. У астатнім пісьменнік захаваў факталогію, верагодна, ён карыстаўся працай польскага гістарыёграфа прускага паходжання Рэйнгальда Гейдэнштэйна, на што ўказваюць наступныя дэталі з мастацкага тэкста: па-першае, згадванне не толькі Свіры, але і Дзісны як месца збору польскага войска; па-другое, Кантрымовіч-Агінскі падрабязна апісаў спосаб навядзення мастоў з дапамогай лодак, пра які паведамляў той жа Гейдэнштэйн. Праўда, у аповесці вынаходнікам такога зручнага і мабільнага спосабу стаў звычайны жаўнер, нават не шляхціч, Ёзаф Валоха. Па-трэцяе, пісьменнік не забыўся на эпізод, відавочна, пачэрпнуты ў «Запісках пра маскоўскую вайну», пра варварскі ўчынак маскавітаў, якія забілі польскіх палонных і сплавілі іх трупы, прымацаваныя да бярвенняў, па Дзвіне на вачах войска Рэчы Паспалітай.

Мастацкасць літаратурнага тэкста абумовіла трансляцыю гістарычнага факта ў абрамленні дакладнасцей, створаных аўтарскім уяўленнем. Так, Я. Кантрымовіч-Агінскі ўзмацніў эмацыянальнае ўздзеянне эпізода за кошт канкрэтызацыі апісанняў: «<…> *do każdej [drewnianej belki] przywiązane były po dwa nagie trupy, haniebnie pokaleczone; ten miał obcięte obie nogi, ten ręce, inny zdartą z głowy skórę, inny rozpłatany brzuch, z którego wychodziły wnętrzności. Stado kruków krążyło ponad wodą […]; niektóre już siedziały na trupach, wydziobując im oczy* <…>» («<...> да кожнага бервяна былі прывязаныя два аголеныя страшэнна пракалечаныя трупы; у аднаго былі адсечаныя абедзве нагі, у другога – рукі, у некага была садраная з галавы скура, у іншага распораты жывот, з якога вывальвалася вантроба. Зграя крумкачоў кружыла над вадой […], некаторыя ўжо сядзелі на трупах, выдзёўбваючы ім вочы») [2, с. 86]. Распараджэнне С. Баторыя вылавіць і пахаваць пацярпелых сцвердзіла гуманнасць кіраўніка Рэчы Паспалітай у процівагу варварам-маскавітам.

Адзначым, што існуе накоторая недакладнасць з выкарыстаннем тапанімічнай назвы «Сярэдні замак» («*Średni zamek*»), якая сустракаецца ў аповесці. Як вядома, у Полацку былі Верхні і Ніжні замкі (апошні называлі Стралецкім), аднак Гейдэнштэйн назваў Верхні замак «сярэдняй крэпасцю», што прывяло да блытаніны ў некаторых працах, на што ўказаў даследчык С. Тарасаў [5, с. 44–45].

Пісьменнік звярнуў увагу на цяжкасці, з якімі прыйшлося сутыкнуцца войску Рэчы Паспалітай: адсутнасць дарог, якія сталі размытымі пад несупынным дажджом, неабходнасць прабівацца праз лясы, што нараслі за шаснаццаць гадоў на палях, якія перасталі засейвацца пасля ўзяцця Полацка Іванам IV. Падрыхтоўка да штурму праходзіла ў надзвычай складаных умовах, прыходзілася капаць умацаванні, стоячы па пояс у вадзе, з-за дажджоў узніклі праблемы з дастаўкай фуражу і харчавання з Літвы: валы не маглі пераадолець бездарожжа. Абмалёўка становішча бачная ў аповесці па наступных дэталях: на трыццаць міль вакол Полацка была амаль пустыня, людзі разбегліся, вёскі сталі спаленыя, да таго ж дарагавізна была такая, што за карэц аўса для каня плацілі дзесяць талераў супраць звычайнага кошту ў трыццаць грошай.

Апісанне ўзяцця Полацка паслядоўна паўтарае «Запіскі…» Гейдэнштэйна, так, вытрымка з гістарыяграфічнай крыніцы «у всех осаждённых было так велико старание потушить пожар, что ни дряхлые старики, ни женщины, ни даже дети не уклонялись от работ или опасности, приносили своим в большом количестве воду и другие средства для тушения пламени…» [4, с. 60] амаль даслоўна працытавана Я. Кантрымовічам-Агіньскім: «*…widzieć można było […] starców, kobiety i dzieci, znoszących wodę do gaszenia pożaru…*» [2, с. 89].

Аднак пісьменнік выбарачна падыходзіў да фактаў і будаваў аповесць на тых, якія не разыходзіліся з ідэйнай накіраванасцю твора. Напрыклад, аўтарам не акцэнтаваная ўвага на ўчынках венгерскіх салдат, якія забілі дзесяць перабежчыкаў-маскавітаў, каб прадухіліць здачу крэпасці і тым самым пазбавіць сябе славы і ўзнагарод за перамогу. Як паведамляў Гейдэнштэйн, «молва о древних богатствах знаменитого города и особенно находящейся в нём церкви св. Софии, о серебряных статуях, о богатейших дарах древних русских князей, которые, как говорили, находились там, возбудила в солдатах надежду на огромную добычу…» [4, с. 66]. У мастацкім творы кіраўнік венгерскіх атрадаў Бекеш не дапусціў такой крывавай расправы.

Пасля ўзяцця Полацка з-за смуроду, які стаяў у горадзе ад не пахаваных маскавітамі трупаў, кароль адклаў малебен з удзячнасцю Богу за атрыманую перамогу, да таго ж вачам заваёўнікаў адкрылася жудасная карціна: паўсюль ляжалі знявечаныя трупы палонных, больш за іншых пацярпелі немцы, іх варылі жывымі, знімалі скуру ласкутамі, адразалі вушы і языкі. Паказальна, што С. Баторый абышоўся з абаронцамі Полацка гуманна: кожнаму было дадзена права выбіраць паміж вяртаннем на радзіму ці далучэннем да падданых караля Рэчы Паспалітай. У аповесці пра Івана IV сказана: «*Kniaź nie umiał przebaczać i najstraszniejsze męki czekały tych, którzy zdali miasto*» («Цар не ўмеў прабачаць і найстрашнейшыя пакуты чакалі тых, хто здаў горад») [2, с. 102]. Аднак з «Запісак…» вынікае, што маскоўскі цар іх памілаваў і адправіў у іншыя крэпасці, каб там яны маглі «смыть с себя бесчестие за сдачу Полоцка» [4, с. 70].

Дзейнасць караля Рэчы Паспалітай па аднаўленні Полацка абазначана ў некалькіх момантах: па-першае, С. Баторый пакінуў праваслаўнаму духавенству цэрквы, загадаўшы вярнуць тыя храмы, якія былі перароблены маскавітамі з ранейшых касцёлаў; па-другое, значная тэрыторыя была выдзелена езуіцкаму Ордэну пад будаўніцтва касцёла і заснаванне акадэміі. Такія крокі сведчаць пра разуменне каралём ролі рэлігіі ў грамадстве і пра стратэгічныя намеры пры вядзенні вайны на тэрыторыі Масковіі мець падтрымку праваслаўнага насельніцтва, пазбаўленага прымусовага акаталічвання. Па-трэцяе, кароль вырашыў адміністрацыйнае пытанне кіравання Полацкам, прызначыў гараднічага (Францыск Жук) і ваяводу (Станіслаў Давойна).

Заключны ваенны эпізод аповесці – узяцце гарнізона крэпасці Сокал, крывавая расправа ў якім была своеасаблівай помстай маскавітам за ўчыненае імі раней. Услед за Гейдэнштэйнам Кантрымовіч-Агінскі распавёў пра выкарыстанне чалавечага тлушчу нямецкімі маркітанткамі для гаення ран, які жанчыны самі дабывалі з цел забітых маскавітаў. Каштоўнасцей тут пераможцы знайшлі значна больш, чым у Полацку, які стаў ахвярай сквапнасці ўсходняга суседа. На апошніх старонках твора аўтар зазначае, што ваенная кампанія перапынілася, кароль накіраваўся на сейм у Варшаву. На пачатку кастрычніка ляглі снягі, і ў дадзеным кантэксце гэта паведамленне можа ўспрымацца як сімвал: белы, чысты покрыў засцілае шматпакутную зямлю, нясе, нарэшце, Прыдзвінскаму краю супакой і мір.

**Заключэнне.** Такім чынам, другая частка гістарычнай трылогіі Я. Кантрымовіча-Агінскага «W promieniach sławy» ўяўляе сабой мастацкую інтэрпрэтацыю аднаго з важнейшых эпізодаў Лівонскай вайны – узяцце Полацка, які пасля шаснаццацігадовага знаходжання ў складзе Масковіі быў вернуты пад уладу Рэчы Паспалітай. Адзначым наступныя асаблівасці трансляцыі гістарычннага матэрыялу ў мастацкім творы: па-першае, верагоднай крыніцай, якой карыстаўся аўтар аповесці, былі «Запіскі пра маскоўскую вайну» Р. Гейдэнштэйна, на што ўказвае шэраг фрагментаў гістарыяграфічнай працы, якія амаль даслоўна ўзноўлены ў аповесці. Па-другое, як вядома, літаратурны твор немагчымы без мастацкага вымыслу, таму пісьменнік увёў у сюжэт не толькі рэальных гістарычных асоб, але і герояў, створаных уласнай фантазіяй (Юзаф Валоха, Ян Вонсік і інш.). Па-трэцяе, у аповесці мы назіраем кампіляцыю двух асобных гісторый, якія шчыльна пераплецены, утвараючы умоўную двухчасткавую кампазіцыю твора. Гэта гісторыя пра дзейнасць Г. Осціка і ўласна апісанне ўзяцця Полацка. Таксама адзначым суб’ектыўны падыход аўтара да гістарычных фактаў, як правіла, пісьменнік выбіраў эпізоды, якія дэманстравалі дзейнасць польскіх жаўнераў і іх саюзнікаў з лепшых пазіцый, змаганне паказана як цалкам справядлівае, асоба караля Рэчы Паспалітай С. Баторыя ідэалізуецца, гэта гуманны кіраўнік, які не прагне чужога, а вяртае сваё, паважае права чалавека на выбар рэлігіі і падданства, згодна з сумленнем карае і ўзнагароджвае. Пісьменнік часам дае ўласныя каментарыі ваенным падзеям з пункту погляду чалавека XIX стагоддзя. Так, паведамляючы пра загад маскоўскага цара спаліць Запалоцце, аўтар згадаў падзеі 1812 года і аналагічную тактыку рускіх – пажар Масквы, якую Напалеон вымушаны быў пакінуць ні з чым. Найбольш папулярныя мастацкія прыёмы, якія выкарыстаў пісьменнік, – гэта супрацьпастаўленне і мастацкая дэталь. Так, на кантрасце пададзены асобы С. Баторыя і Івана Грознага, палітыка Масковіі і Рэчы Паспалітай, мастацкая дэталь дапамагае стварыць аповед эмацыянальна насычаным, акрамя таго, пры партрэтным апісанні яна дапамагае пісьменніку падкрэсліць дамінуючыя рысы характару героя.

Нягледзячы на маштабнасць, значнасць узноўленай гістарычный падзеі, аўтар не абышоў увагай лёс звычайнага чалавека, які апынуўся ў віхуры вайны. Гэта тэма праходзіць праз дзейнасць звычайных прадстаўнікоў польскага народа, маладых жаўнераў Вонсіка і яго сябра Валохі, аповед пра якіх пачаты ў першай частцы трылогіі.

У цэлым, гістарычная аповесць «Połock» дэманструе аўтарскую ідэю праслаўлення перамогі Рэчы Паспалітай у багатым на ваенныя падзеі гістарычным мінулым, а таксама асобы мудрага і справядлівага дзяржаўнага дзеяча – Стэфана Баторыя, таленавітага палітыка і стратэга. Натуральна, што пісьменніцкі погляд на гістарычныя рэаліі не пазбаўлены нацыянальнага стэрэатыпу ў адносінах да ўсходняй дзяржавы, народ якой, з пункту погляду палякаў, падпарадкоўваўся тырану, быў пазбаўлены вольнасці і вымушаны цярпець прыгнёт. Думаецца, менавіта ўплыў дадзенага трывалага стэрэатыпу абумовіў пісьменніцкую суб’ектыўнасць у адборы фактаў і іх трансляцыі. Аповесць, створаная ў рэчышчы добра распрацаванай у польскай літаратуры XIX стагоддзя гістарычнай тэматыкі, дапаўняе корпус твораў прыгожага пісьменства пра важнейшыя падзеі гісторыі Рэчы Паспалітай.

ЛІТАРАТУРА

1. Сафійка. Полацк. Родны край: проза, паэзія, эсэ /уклад. Н. Гальпяровіча. – Мінск : Маст. літ., 2017. – 286 с.
2. Kontrymowicz-Ogiński, J. W promieniach sławy: powieść historyczna z XVI wieku: w 3 t. / J. Kontrymowicz-Ogiński. – T. 2. Połock. – Chicago, 1909. – 111 s.
3. Рублевская, Л. Рыцари и Дамы Беларуси: исторические очерки / Л. Рублевская. – Мінск : Маст. літ., 2013. – 246 с.
4. Гейденштейн, Р. Записки о Московской войне (1578-1582). Издание археографической комиссии / Р. Гейденштейн / пер. с латинского. – СПб. : Тип. Мин-ва внутренних дел, 1889. – 309 с.
5. Тарасаў, С.В. Полацк IX-XVII стст.: гісторыя і тапаграфія / С.В. Тарасаў. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 183 с.

REFERENCES

1. *Safiika. Polatsk. Rodny krai: proza, paehziya, ehseh* [*Sofiyka. Polotsk. Native land: prose, poetry, essays*] (2017). Minsk: Mast.lit. (In Belaruss.)
2. Kontrymowicz-Ogiński, J. (1909). *W promieniach sławy: powieść historyczna z XVI wieku*: v 3 t. T. 2. [*In the Rays of glory: a historical novel from the XVI century (in 3 vol., Vol. 2*]. Chicago (In Pol.)
3. Rublevskaya, L. (2013). *Rytsari i Damy Belarusi: istoricheskie ocherki* [*Knights and Ladies of Belarus: historical essays*]. Minsk.: Mast. lit. (In Belaruss.)
4. Geidenshtein, R. (1889). *Zapiski o Moskovskoi voine (1578–1582)*. Izdanie arkheograficheskoi komissii. S.-Peterburg: Tipografiya ministerstva vnutrennikh del. (In Russ.)
5. Tarasaŭ, S.V. (1998). *Polatsk IX-XVII ctst.: gistoryya i tapagrafiya*. Minsk: Belaruskaya navuka. (In Belaruss.)

*Паступіў 15.09.2021*

## ХУДОЖЕСТВЕННАЯ РЕЦЕПЦИЯ ИСТОРИИ XVI ВЕКА В ТРИЛОГИИ ЯНА КАНТРИМОВИЧА-АГИНСКОГО «W PROMIENIACH SŁAWY»: ВЗЯТИЕ ПОЛОЦКА

***Г.А. ГЛАДКОВА***

*В статье на материале итсорической повести Яна Кантримовича-Агинского «W promieniach sławy» рассматривается художественная рецепция военных событий второй половины XVI века – поход короля Речи Посполитой Стефана Батория на Полоцк и взятие города в 1579 году как части заключительного этапа Ливонской войны. Отмечена специфика авторской интерпретации исторического материала, выявлен историографический источник, положенный в основу повести, учтено влияние национального стереотипа, который проявился в отборе письменных фактов и особенностях их художественной трансляции. Необходимое внимание уделено композиционным приёмам, позволившим Я. Кантримовичу-Агинскому совместить в единстве два отдельных эпизода тогдашней истории: попытку организовать замах на жизнь польского короля и руководство С. Баторием штурмом укреплений Полоцка. Выделены основные приёмы создания художественных образов (идеализация, художественный параллелизм и др.).*

***Ключевые слова:*** *Речь Посполитая, Ливонская война, осада Полоцка, рецепция, национальный стереотип, художественный образ, жанр, стиль.*

## ARTISTIC RECEPTION OF THE HISTORY OF THE XVI CENTURY IN THE TRILOGY OF JAN KONTRIMOVICH-OGINSKY» IN THE RAYS OF GLORY": THE CAPTURE OF POLOTSK

***H. HLADKOVA***

*The article, based on the material of the historical novel by Jan Kontrimovich-Oginsky «In the rays of glory», examines the artistic reception of the military events of the second half of the XVI century – the campaign of the King of the Polish-Lithuanian Commonwealth Stefan Batory to Polotsk and the capture of the city in 1579 as part of the final stage of the Livonian War. The specificity of the author's interpretation of the historical material is noted, the historiographic source that forms the basis of the story is revealed, the influence of the National stereotype that manifested itself in the selection of facts for writers and the features of their artistic translation is taken into account. Attention is also paid to compositional techniques that allowed J. Kontrimovichts-Oginsky to combine two separate episodes of the then history into a unity: an attempt to organize an attempt on the life of the Polish king and the leadership of S. Batory assault on Polotsk. The main methods of quarreling of artistic images are highlighted (idealization, artistic parallelism etc.).*

***Keywords:*** *the Polish-Lithuanian Commonwealth, the Livonian War, Asada Polotsk, reception, national stereotype, artistic image, genre, style.*